**«ГУ́ТАРКА ДАНІ́ЛЫ СА СЦЯПА́НАМ»**, ананімны твор беларускай л-ры сярэдзіны 19 ст. Напісана напярэдадні сялянскай рэформы 1861. Упершыню апублікавана П.В.Шэйнам у час. «Русская старина» (1886, т. 49). Пабудавана ў форме маналога сведкі размовы сялян. Мае выразны антыпрыгонніцкі змест, сцвярджае доўгачаканае эканам. і сац. разняволенне бел. селяніна. Аўтар выяўляе супярэчнасці сялянскага светапогляду: з аднаго боку, пан і войт — сац. антаганісты, якія стаяць на шляху да вольнасці (падманваюць цара, узводзяць паклёп на мужыка), з другога боку, сац. мір з імі — неабходная ўмова «дабра і ладу». Даніла са Сцяпанам не ўзнімаюцца да ідэі ўзброенага пратэсту, як збавення чакаюць адмены прыгону, спадзяюцца на заступніцтва цара і Бога («Як Бог і цар хоча, мусіць, так і трэба»). Адчуваецца моцная вера ў магчымасць існавання патрыярхальнага грамадства, дзе над усімі пануе Бог, а над мужыком — толькі цар («Каб быў мужык волен ды цар яго панам, // Каб не смеў ніколі зваць пан яго хамам»). Героі перакананы ў непазбежным маральным удасканаленні паноў, якія пасля адмены прыгону «паскрабуць чупрыну, як не стане хлеба» і зразумеюць злыбеды сваіх падданых. Будучая сац. ідылія абмалёўваецца як эканам. дыялог роўных з роўнымі («Не адзін сказаў бы: мой пане Сцяпане, // Будзь ласкаў, сягоння прыйдзі на гаранне, // Заплачу, што хочаш»). Разам з тым завяршэнне «Гутаркі» — размову сялян спыніў злы войт — сведчыць аб марнасці спадзяванняў на сац. замірэнне з тымі, хто «мужыка глуміць і плакаць яму не дае». *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова